Арганізаваная злачыннасць цікавіцца «жывымі каштоўнасцямі»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Што ўяўляла сабой арганізаваная злачыннасць у савецкі час на тэрыторыі нашай краіны і што адбылося ў 90-я?

— У час агульнага крызісу эканомікі, масавага зараджэння рынкавых адносін і спадарожных ім «шэрых» схем вядзення бізнэсу ў выніку адсутнасці належнага нарматыўнага рэгулявання новых праваадносін, з'яўлення «шалёных» грошай у прадпрымальнікаў, асноўнымі формамі арганізаванай злачыннасці сталі вымаганні, у тым ліку пад відам забеспячэння «крымінальнага даху», разбоі, махлярствы, выкраданні з мэтай выкупу і г.д. Усё гэта рабілася дзеля накаплення першапачатковага крымінальнага капіталу, які затым можна было «пусціць у справу», у тым ліку з выкарыстаннем набытых карупцыйных сувязяў у дзяржструктурах. Дзякуючы ценаму ўзаемадзеянню нашых падраздзяленняў з тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў, іншымі праваахоўнымі органамі краіны, а таксама нашымі калегамі з замежных дзяржаў, удалося не дапусціць у краіне такога разгулу крыміналу, як гэта назіралася дый мае месца цяпер у шэрагу постсавецкіх краін.

— Як мянялася сітуацыя на працягу апошніх дзесяці гадоў?

— На месца «кораткa стрыжаных качкоў для збору даніны» прыйшлі «майстры крымінальных фінансавых афер» — аргзлачыннасць агульнакрымінальнай накіраванасці стала ўсё больш уключацца ў розныя фінансава-эканамічныя схемы, асабліва звязаныя з дзейнасцю буйных вытворчых прадпрыемстваў. Невыпадкова ў першыя гады стабілізацыі эканомікі з'яўляліся шматлікія пасрэдніцкія камерцыйныя структуры, створаныя як крымінальнымі «аўтарытэтамі» на раней «зароблены» сродкі, так і тыя, што функцыянавалі па прынцыпе «сваяцтва». Праз такія кампаніі кантраляваліся ўсе гандлёва-грашовыя здзелкі — ад пастаўкі сыравіны, абсталявання і камплектуючых да канчатковага збыту гатовай прадукцыі. Ільвіная доля прыбытку асядала ў кішэнях кіраўнікоў падобных структур, а нячыстыя на руку чыноўнікі на прадпрыемствах атрымлівалі за «пасрэдніцтва» немалыя грошы, з-за чаго ўсяляк лабіравалі дзейнасць «патрэбных» фірмаў. У апошні час такіх гандлёва-праводных схем з выкарыстаннем пасрэдніцкіх камерцыйных структур становіцца ўсё менш. Гэта абумоўлена не толькі агульнадзяржаўнай палітыкай і адпаведнымі арганізацыйна-прававымі мерамі, скіраванымі на забеспячэнне атрымання максімальнага прыбытку непасрэдна дзяржаўнымі прадпрыемствамі ў выніку заключэння прамых дамоўленасцяў пастаўкі або продажу, але і мэтанакіраванай дзейнасцю праваахоўных органаў.

Адной з прыярытэтных задач падраздзяленняў нашага ўпраўлення з'яўляецца менавіта папярэджванне шкоды, а таксама вяртанне страт, звязаных з учыненнем злачынства. Летась, напрыклад, мы вярнулі стратаў на суму больш за 20 млрд рублёў, папярэдзілі шкоду на суму каля 83 млрд рублёў.

Таксама як агульную, уласцівую Беларусі на працягу апошніх гадоў тэндэнцыю, варта назваць змяненне вектара аргзлачыннасці ў галіну наркабізнэсу, гандлю людзьмі і незаконнай міграцыі, дзе абарот фінансавых сродкаў на парадкі вышэй, чым у аяродку агульнакрымінальнай злачыннасці.

— У такой разнавіднасці аргзлачыннасці, як гандаль людзьмі, замацоўваюцца новыя віды супрацьпраўнай дзейнасці — гандаль органамі і сэкс-турызм. Ці можна меркаваць, што гэтыя віды будуць развівацца ў Беларусі, наколькі складана тут трымаць сітуацыю пад кантролем?

— Найбольш небяспечнымі для інтарэсаў дзяржавы і грамадства праявамі аргзлачыннасці з'яўляюцца злачынствы не агульнакрымінальнага кшталту — крадзяжы, разбоі, вымаганні, махлярствы і г.д., а менавіта злачынствы, звязаныя з гандлем людзьмі. Толькі падраздзяленнямі нашага ўпраўлення летась выяўлены 63 злачынствы ў галіне гандлю людзьмі — на 15 больш, чым у годзе папярэднім. Спынена дзейнасць адной злачыннай арганізацыі і дзвюх арганізаваных груп, якія займаліся такой злачыннасцю. Перакрыты 23 каналы незаконнага вывазу людзей за мяжу ў 10 краін свету. Выяўлена 115 ахвяр гандлю людзьмі, у тым ліку 14 няпоўнагадовых.

Мінулы год таксама паказаў, што ў Беларусі праявіліся і не ўласцівыя раней для нашай краіны формы аргзлачыннасці. Размова ідзе пра незаконную транспланталогію. Калі раней гандаль людзьмі разглядаўся ў кантэксце сэксуальнай эксплуатацыі, то цяпер — з мэтай адбірання донарскіх органаў. Прэвентыўная работа, якая вялася на працягу апошніх гадоў, дазволіла спыніць дзейнасць міжнароднай арганізаванай групы з ліку грамадзян Украіны, Ізраіля і іншых краін. На працягу 2008-2010 гадоў група займалася «чорнай транспланталогіяй». Яе ўдзельнікі на тэрыторыі Беларусі, Украіны, Расіі і іншых краін падбіралі і вербавалі донараў для вывазу ў Эквадор, Косава для правядзення незаконных аперацый па адбіранні ў іх ныркі і перасадкі заможным рэцыпіентам. Ахвярамі злачынцаў сталі, у тым ліку, і грамадзяне Беларусі.

Сёння Беларусь з'яўляецца адной з вядучых краін у галіне транспланталогіі, і ў той жа час мы лічым, што нацыянальнае заканадаўства ў гэтай галіне не ў поўнай меры адпавядае міжнародным стандартам, што пры пэўных умовах можа спрыяць уцягванню грамадзян нашай краіны ў рынак нелегальнай транспланталогіі.

Што да кантролю над сітуацыяй, то некарэктна гаварыць аб кантролі над злачыннасцю, тым больш над арганізаванымі формамі яе праяўлення. Гэта звязана з высокай латэнтнасцю асобных відаў злачынных дзеянняў, у тым ліку гандлю людзьмі з мэтай сэксуальнай эксплуатацыі.

— Што можна сказаць пра ўзровень карупцыі і хабарніцтва? Як выглядала сітуацыя летась?

— Сусветны вопыт паказвае, што карупцыя працвітае, калі дзяржава перажывае сур'ёзныя цяжкасці ў развіцці або знаходзіцца ў стадыі мадэрнізацыі і пераходзіць да новых спосабаў упраўлення эканомікай. Карупцыя існавала заўсёды, барацьба з гэтай з'явай вядзецца пастаянна і, хочацца спадзявацца, паспяхова. Летась выяўлена 3,6 тыс. карупцыйных злачынстваў (67 працэнтаў — па матэрыялах органаў унутраных спраў) — на 271 больш, чым у 2009 годзе. Аднак у агульнай масе зарэгістраваных па рэспубліцы злачынстваў — а такіх 140 тысяч — удзельная вага карупцыйных злачынстваў невялікая і складае 2,9 працэнта. Паранейшаму тут пераважаюць злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі, службовы падлог, хабарніцтва. Найбольш падвержаныя такім з'явам сельская гаспадарка, прамысловасць, гандаль, дзяржаўнае кіраванне, адукацыя. Дарэчы, у параўнанні з 2009 годам колькасць фактаў атрымання хабару вырасла летась з 418 да 608, пасрэдніцтва ў хабарніцтве — з 19 да 31. Наша ўпраўленне выявіла летась 441 карупцыйнае злачынства, у тым ліку 135 фактаў дачы хабару і 108 — атрымання хабару. Да крымінальнай адказнасці за здзяйсненне карупцыйных злачынстваў, па якіх завершана папярэдняе расследаванне, прыцягваецца 1969 службовых асоб, з якіх 7 займаюць адказнае становішча.

Аналізуючы шматлікія факты так званай бытавой карупцыі (напрыклад, крадзяжы таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў на ўзроўні загадчыка складам або атрыманне хабару ўрачамі за выдачу лісткоў часовай непрацаздольнасці ці выкладчыкамі за прыняцце залікаў), варта задумацца, наколькі аб'ектыўна такія дзеянні гэтых асобных грамадзян, не надзеленых значнымі дзяржаўна-ўладнымі паўнамоцтвамі, характарызуе ступень карупцыйнасці грамадства. Варта ўлічваць і тое, што нярэдка вялікая колькасць карупцыйных злачынстваў у той ці іншай галіне абумоўлена не яе значнай схільнасцю да карупцыі, а тлумачыцца, скажам, выяўленнем шматлікіх фактаў атрымання хабару адной і той жа службовай асобай. Таму не хацелася б рабіць нейкія грунтоўныя высновы адносна стану карупцыі ў нашай дзяржаве. Можна толькі адзначыць, што меры, скіраваныя на больш эфектыўнае супрацьдзеянне апошняй, прымаюцца пастаянна. На пачатку гэтага года ўступіла ў сілу пагадненне аб уступленні Беларусі ў Групу дзяржаў супраць карупцыі.

— Наколькі эфектыўнае выяўленне ўсяго ланцуга наркагандлю «знізу» — падчас спецыяльных праверак дыскатэк, бараў, гасцініц і іншых устаноў?

— Для выяўлення і прыцягнення да адказнасці нарказбытчыкаў прыцягваецца ўвесь арсенал сродкаў і метадаў, якія знаходзяцца ў распараджэнні праваахоўных органаў. Ніводная інфармацыя аб фактах збыту наркотыкаў не застаецца без увагі. Безумоўна, асноўная мэта падраздзяленняў па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю — спыненне дзейнасці менавіта буйных, аптовых наркагандляроў, перакрыванне каналаў наркатрафіку транснацыянальных арганізаваных груп. Аднак гэта не азначае, што мы закрываем вочы на злачынныя дзеянні адзіночных распаўсюджвальнікаў нарказелля.

Летась супрацоўнікамі ўпраўлення выяўлена 167 злачынстваў у галіне незаконнага абарачэння наркотыкаў, у тым ліку 91 з мэтай іх збыту. Ліквідавана 17 каналаў паступлення ў краіну наркотыкаў і псіхатропаў. З незаконнага абарачэння канфіскавана 74,7 кг наркасродкаў і 5,6 кг псіхатропных рэчываў.

— Ці лічыце вы, што ў органах аховы правапарадку, у прыватнасці, у вашым упраўленні, працуе дастатковая колькасць супрацоўнікаў?

— Штатную колькасць і структуру падраздзяленняў па барацьбе з аргзлачыннасцю і карупцыяй вызначае міністр. Кіраўніцтва глаўка з улікам аналізу сітуацыі, змены функцый уносіць прапановы па ўдасканаленні гэтай структуры... Мы вырашаем пастаўленыя перад намі задачы тымі сіламі, якія ў нас ёсць. Напрыклад, у 2010 годзе ўпраўленне разам з калегамі КДБ Беларусі выявіла анархісцкую арганізацыю «Аўтаномнае дзеянне», якая дзейнічала на тэрыторыі краіны. Выяўлена каля 50 яе актыўных удзельнікаў — жыхароў Мінска, Баранавіч, Салігорска і іншых гарадоў. У асноўным гэта маладыя людзі ва ўзросце да 25 гадоў. Удалося высветліць, што члены гэтай арганізацыі маюць дачыненне да шэрагу злачынстваў у розных рэгіёнах рэспублікі, у тым ліку да хуліганскіх дзеянняў, якія суправаджаліся пашкоджаннем аўтамашыны, якая належала Пасольству Расійскай Федэрацыі ў Мінску. Усе супрацьпраўныя дзеянні ўдзельнікаў гэтай арганізацыі насілі ярка выражаны экстрэмісцкі характар. На жаль, адкрытасць нашай краіны часам спрыяе распаўсюджванню на тэрыторыі рэспублікі ідэй, якія не адпавядаюць імкненню грамадзян жыць у бяспецы ад экстрэмісцкіх праяў... Улічваючы прыведзеныя абставіны, ва ўпраўленні створана падраздзяленне па супрацьдзеянні экстрэмізму.

— Як бы вы ацанілі якасць работы супрацоўнікаў упраўлення па барацьбе з аргзлачыннасцю? Колькі чалавек былі адхіленыя ад работы або прыцягнутыя да адказнасці за службовую неадпаведнасць, парушэнне закона?

— Як і ў любым вялікім калектыве, ніхто з кіраўнікоў не застрахаваны ад таго, што нехта з падначаленых парушыць закон. Летась па розных прычынах з нашага падраздзялення звольнілі некалькі супрацоўнікаў, у тым ліку аднаго — за правіну, якая дыскрэдытуе званне супрацоўніка органаў унутраных спраў. Разам з тым за ўзорнае выкананне службовых абавязкаў, высокія паказчыкі ў аператыўна-службовай дзейнасці двое супрацоўнікаў галоўнага ўпраўлення былі ўзнагароджаны дзяржаўнымі ўзнагародамі, больш за сотню разоў супрацоўнікі заахвочваліся міністрам унутраных спраў.

Я хацеў бы выказаць падзяку супрацоўнікам галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй, павіншаваць усіх з Днём беларускай міліцыі і 20-гадовым юбілеем з дня стварэння службы. Зычу моцнага здароўя, аптымізму, выдатнай работы на карысць краіны і мірнага сонечнага неба над галавой!

Святлана БАРЫСЕНКА.

Абзац

◢ **Сёння спаўняецца 20 гадоў самай папулярнай інфармацыйна-аналітычнай перадачы Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё «Радыёфакт». Увесь гэты час кожную новую раніцу працоўнага дня карэспандэнты і вядучыя праграмы расказваюць пра ўсё самае адметнае ў краіне і за яе межамі. Пачынаць дзень з «Радыёфакта» стала добрай традыцыяй шматлікай аўдыторыі радыёслухачоў. Са святам, калегі! Няхай кожны новы дзень будзе ўдалым для вас і вашых слухачоў!**

◢ Учора па вуліцы Алібегава ў Мінску пры правядзенні мантажных работ на адным з аб'ектаў з вышыні 15 м упаў вежавы кран. Кранаўшчык з рознымі траўмамі трапіў у бальніцу.

Поўны абзац

◢ **Зяць западозрыў цешчу ў крадзяжы білетаў на футбол. На наступным тыдні ў Кіеве адбудзецца найважнейшы матч для каманды «Дынама». Мужчына, які зараней купіў білеты на матч, звярнуўся ў міліцыю з патрабаваннем арыштаваць яго цешчу, якую ён падазрае ў крадзяжы білетаў. Балельшчык сцвярджаў, што маці яго жонкі ненавідзіць футбол, а больш за ўсё не любіць, калі зяць ходзіць на стадыён. Прычына банальная: мужчына любіць выпіць піва падчас і пасля матча. Заядлы балельшчык сцвярджаў у міліцыі, што ніхто, акрамя цешчы, не мог паквапіцца на білет, пакінуты дома. Магла яна, на думку чалавека, і перапрадаць білет, калі даведалася пра яго кошт. Аднак праз гадзіну пасля звароту мужчына адклікаў сваю заяву і адмовіўся ад абвінавачванняў. Міліцыянеры ўпэўненыя, што такая перамена адбылася не без удзелу жонкі.**

◢ Мужчыну-дэпутата ў Кеніі выгналі з залы пасяджэнняў за тое, што ён прыйшоў з брыльянтавымі завушніцамі. Рашэнне аб выдварэнні з сесіі 35-гадовага Гідыёна Мбуві — дэпутата аднапалатнай Нацыянальнай асамблеі — прыняў віцэ-спікер Фарах Маалім. Ён заявіў, што ніколі з моманту існавання палаты ніводзін мужчына-дэпутат не прыходзіў на пасяджэнне з завушніцамі ці якімі іншымі прадметамі ў вушах. Падобныя паводзіны, падкрэсліў спікер, псуюць імідж заканадаўчага органа краіны.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

НА ПАЖАРЫ ЗАГІНУЎ ГАСПАДАР КВАТЭРЫ

Пра пажар у васьмікватэрным цагляным двухпавярховым жылым доме ў вёсцы Гасцілавічы ўвечары ў Лагойскае раённае падраздзяленне МНС паведаміла суседка.

На месцы работнікі МНС з кватэры на першым паверсе выратавалі гаспадара, пенсіянера, якога перадалі брыгадзе «хуткай дапамогі». Аднак па дарозе ў раённую бальніцу ён сканаў... Работнікамі МНС на лесвіцы з кватэры на другім паверсе была таксама выратаваная вучаніца 1 класа. Яна не пацярпела. На момант пажару дзяўчынка была дома па прычыне хваробы, а бацькі знаходзіліся на працы. У выніку пажару выгараў пакой 3х4 метра, закураныя сцены і столь трохпакаёвай кватэры на першым паверсе. Мяркуецца, што прычынай здарэння стала неасцярожнасць з агнём загінулага.

Сяргей РАСОЛЬКА.

В извещении **Гродненского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки»** о проведении аукциона по продаже имущества (газета «Звязда» № 28 от 12.02.2011 г., 7-я полоса) **Лот № 5 снимается с аукциона.**
Тел. для справок: (8 0152) 41 98 32, 41 98 34. УНП 500833225.

Объявление, опубликованное в газете «Звязда» № 14 от 25.01.2011 г. в части утери и недействительности страхового полиса компании ЗАСО «Промтрансинвест» по страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств серии ВС № 2876437, **считать недействительным.** УНП 100357923

Повестку дня общего собрания акционеров ОАО «Белторгстрой», опубликованную в № 34 от 22.02.2011 г., **ДОПОЛНИТЬ ПУНКТОМ СЛЕДУЮЩЕГО СОДЕРЖАНИЯ:**
- Об увеличении уставного фонда Общества. УНН 100633428

Падпіска-2011 *(Працяг будзе.)*

З ВЕСНАВЫМ НАСТРОЕМ

Першыя дні вясны для некаторых нашых падпісчыкаў, паштальёнаў і кіяскёраў сталі сонечнымі не толькі з прычыны добрага надвор'я, але і з-за прыезду газеты «Звязда» ў многія куткі Беларусі са шматлікімі падарункамі. Зрэшты, іх было каля дзясятка, і маршрут паездкі за некалькі дзён умясціў у сябе сустрэчы ў 14 раёнах краіны.

Асноўны «ўдар» быў скіраваны на Гомельшчыну і абласны цэнтр, дзе меркавалася пакінуць ільвіную долю цяперашняга прызавога фонду. Ваяж быў пачаты з Мар'інай Горкі. Візіты ветлівасці ў райвыканкам і галоўную пошту пакінулі ўпэўненасць, што да старэйшага беларускамоўнага выдання тут ставяцца з вялікай павагай, таму з падпіскай у раёне будзе ўсё добра. Яшчэ большы аптымізм напаткаў нас у Асіповічах, а гэта ўжо Магілёўшчына, дзе нашай даўняй падпісчыцы Марыі Сімановіч з вёскі Усцеж мы прывезлі каляровы тэлевізар «Віцязь», які яна выйграла ў штоквартальнай звяздоўскай латарэі. З улікам таго, што Марыя Міхайлаўна ўжо даўно размяняла дзявяты дзясятак, то за каштоўным прызам прыехаў малады чалавек па імені Ігар — муж унучкі Святланы. Ён жа паведаміў, што бабуля нават у такім паважаным узросце вельмі любіць «Звязду». Зрэшты, за свой працяглы падпісны стаж яна ўжо паспела выйграць у нашай газеце наручны гадзіннік і электраміксер. Ці то жартам, ці то ўсур'ёз начальнік мясцовага РВПС Валерыя Матузава сказала, што «Звязда» апошнім часам зачасціла ў Асіповічы з добрымі прызамі, таму ў самы бліжэйшы час асабіста афарміць на яе падпіску.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

ГЕНАДЗЬ НЯВЫГЛАС ПАКІДАЕ ПАСАДУ КІРАЎНІКА ФЕДЭРАЦЫІ ФУТБОЛА

Генадзь Нявыглас, які кіраваў беларускім футболам з 2003 года, учора на прэс-канферэнцыі, якая праходзіла пасля пасяджэння выканкама федэрацыі футбола, паведаміў, што балатавацца на новы, трэці тэрмін на пасаду кіраўніка федэрацыі не будзе. Нагадаем, што выбары старшыні федэрацыі футбола павінны былі прайсці ў канцы сакавіка.

— На жаль, я трапіў у спіс невыязных. Без сумненняў, гэта перашкаджае кіраваць арганізацыяй, якая не можа абысціся без міжнародных кантактаў. Падругое, гэта прычыны асабістага характару. Ёсць некаторыя асабістыя пытанні, вырашаць якія, займаючы гэту пасаду, будзе складана. Па-трэцяе, не хацелася ствараць канфліктную сітуацыю на перадвыбарным этапе, што магло б сапсаваць імідж федэрацыі, — патлумачыў Нявыглас.

Як паведамлялася раней, выбары кіраўніка футбола павінны былі праходзіць не на безальтэрнатыўнай аснове — сваю кандыдатуру на справаздачна-выбарную канферэнцыю вылучыў віцэ-прэм'ер Сяргей Румас. Прычым зроблена гэта было ў апошні дзень падачы заявак. Генадзь Нявыглас патлумачыў, што ранейшая працэдура выбараў не адпавядала патрабаванням выбарчага кодэкса ФІФА, і ўсе ранейшыя вылучэнні ліквідаваны несапраўднымі. Але час, каб вылучыць кандыдатуры, яшчэ ёсць. Правядзенне справаздачна-выбарнай канферэнцыі перанесена з сакавіка на 22 красавіка, а прыём заяў ад кандыдатаў працягнецца да 1 красавіка.

Генадзь Нявыглас выказаўся пра свайго магчымага пераемніка:

— Я ведаю Сяргея Румаса. Гэта выдатны малады чалавек. Калі ён, як віцэ-прэм'ер, здолее трансфармаваць нашу праграму развіцця футбола ў дзяржаўную, я буду вельмі задаволены. Румас не супрацоўнічаў раней з федэрацыяй футбола. Асабіста я на футбольных матчах яго не бачыў. Але я ведаю яго як камунікабельнага чалавека і добрага менеджара.

Генадзь Нявыглас падкрэсліў, што не разглядае вылучэнне кандыдатуры Сяргея Румаса як страту даверу:

— Тыя вынікі, якія ёсць у футболе зараз, не даюць падстаў так меркаваць. Але ратацыя павінна быць. Тое, што я не буду вылучаць сваю кандыдатуру, з «эфектам Румаса» не звязана. Я баявы генерал, Румаса не баюся.

Тое, што для Сяргея Румаса як для магчымага кіраўніка футбола гэта будзе не асноўным працоўным месцам, Генадзь Нявыглас ацаніў наступным чынам:

— Усе асноўныя поспехі наш футбол атрымаў у апошнія 2 з паловай гады, калі я працаваў на пасадзе кіраўніка пастаянна. Але, магчыма, гэта проста супадзенне. У любым выпадку мы стварылі калектыў, апарат, які здольны выдатна працаваць.

На пытанне, ці будзе альтэрнатыва Румасу на гэтых выбарах, Генадзь Нявыглас адказаў наступнае:

— Мяне на кожным матчы чалавек 20 вучаць, як кіраваць футболам. Адказваю ім: ідзіце і паспрабуйце. Але ахвотных няма. У любым выпадку прапаноўваць сваю кандыдатуру павінен чалавек пазнавальны, які мае пасаду.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Открытое акционерное общество «Управление механизации № 91»

Адрес: г. Минск, ул. Комсомольская, 11

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

млн руб.

АКТИВ	Код строки	На начало отчетного периода	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Итого по разделу 1	190	20303	27794
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Итого по разделу 2	290	1651	3072
БАЛАНС (190+290)	**300**	**21954**	**30866**
ПАССИВ			
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
ИТОГО по разделу III	490	6292	18343
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
ИТОГО по разделу IV	590	15414	11334
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
ИТОГО по разделу V	690	248	1189
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**21954**	**30866**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ	Код строки	За отчетный период	За отчетный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	7765	5298
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	422	345
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей)	020	7343	4953
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	6414	4860
Валовая прибыль	040	929	93
Расходы на реализацию	060		
Прибыль (убыток) от реализации	070	929	93
II. ОПЕРЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	812	645
Операционные расходы	100	130	57
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	120	562	487
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	49	23
Внереализационные расходы	150	389	180
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	160	-340	-159
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	200	1151	421
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения	240	1151	421
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	**300**	**706**	**225**

Директор ОАО «Управление механизации № 91» **С.В. Сидляревич**
Гл. бухгалтер **Т.Б. Козлова**
УНП 100055130

Информация о проведении внеочередного Общего собрания акционеров ЗАО «ТК Банк»

Наименование и место нахождения хозяйственного общества: Закрытое акционерное общество «Банк торговый капитал», Республика Беларусь, 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 65 А.

Внеочередное Общее собрание акционеров ЗАО «ТК Банк» состоится 15 марта 2011 года в 12.00 по адресу: Исламская Республика Иран, г. Тегеран, ул. Телегани, на углу ул. Неджатоллахи.

Повестка дня:

О внесении изменений в Устав ЗАО «ТК Банк».

Внеочередного Общее собрание акционеров ЗАО «ТК Банк» созывается по инициативе Совета Директоров ЗАО «ТК Банк».

Основание созыва: необходимость внесения изменений в Устав ЗАО «ТК Банк».

Форма проведения Общего собрания акционеров ЗАО «ТК Банк» – очная.

Информация, необходимая для принятия решений по повестке дня внеочередного Общего собрания акционеров ЗАО «ТК Банк», предоставляется по первому требованию лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров ЗАО «ТК Банк», заявленному в обращении на имя Председателя Правления ЗАО «ТК Банк» по адресу: Республика Беларусь, 220035, г. Минск, ул.Тимирязева, 65 А.

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров ЗАО «ТК Банк», составляется на основании данных реестра владельцев акций, сформированного на 03 марта 2011 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров ЗАО «ТК Банк», производится с 11.00 до 12.00 15 марта 2011 года по адресу: Исламская Республика Иран, г. Тегеран, ул. Телегани, на углу ул. Неджатоллахи.

УНП 807000163.

БПС-БАНК

ОАО «БПС-Банк» 25 февраля 2011 года провело внеочередное Общее собрание акционеров в форме заочного голосования с повесткой дня:

1. Об оказании банком безвозмездной (спонсорской) помощи в 2011 году.

Решение принято единогласно.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк».

Минский городской центр недвижимости

Извещение о проведении 06 апреля 2011 года открытого аукциона по продаже недвижимого имущества ОАО «Автомагистраль»

Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)	- Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) – Здание складов общей площадью 456,4 кв.м, инвентарный номер 500/С-49868, литер Ж 1/к
Сведения о земельном участке	Кадастровый номер 500000000004004175, площадь – 0,2360 га, назначение – эксплуатация и обслуживание здания специализированного для ремонта и технического обслуживания автомобилей
Местонахождение продаваемого имущества	г. Минск, ул. Кижеватова, д. 8
Сведения о продавце	ОАО «Автомагистраль», ул. Кижеватова, д. 8, 220099, г. Минск
Сведения об организаторе аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск
Начальная цена предмета торгов с учетом НДС	229 678 937 белорусских рублей
Сумма задатка	22 900 000 белорусских рублей
Наличие обременений	Аренда; строительство отдельного проезда на земельном участке, предназначенном для обслуживания отчуждаемого капитального строения

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012037450010, в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 153001334, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **06 апреля 2011 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 07.03.2011 по 04.04.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (017) 212 50 62.
Сайт в интернете: www.mgcn.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ КАПИТАЛЬНОГО СТРОЕНИЯ, НАХОДЯЩЕГОСЯ В СОБСТВЕННОСТИ ОАО «Желдорсервис»

№ лота	Наименование объекта, его местонахождение, арендуемая площадь, кв.м	Начальная цена продажи, руб.	Сумма задатка, руб.	Характеристика объекта	Коэффициент к базовой ставке арендной платы*
1	Право заключения договора аренды капитального строения (инвентарный номер капитального строения 710/С–39765), расположенного в г. Бобруйске, ул. Западная, д. 26а, арендуемой площадью 621,0 кв.м.	5 433 750	543 370	Одноэтажное кирпичное здание 2004 г. постройки. Фундамент бетонный; стены, перегородки – кирпичные; перекрытие – железобетонное; оконные проёмы – двойные, окрашены; двери – филенчатые, металлические; стены – оштукатурены, окрашены. Имеется теплоснабжение, электроснабжение, водоснабжение, канализация, телефон.	1,0

Срок договора аренды – 5 лет.

Аукцион состоится 5 апреля 2011 года в 15.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а. Заявки принимаются ежедневно с 4 марта 2011 в рабочие дни с 8 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 411. **Последний день приема заявок – «1» апреля 2011 года**. Заключительная регистрация участников аукциона «5» апреля 2011 года с 14 до 15 часов.

Организатор аукциона: МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.

Продавец: ОАО «Желдорсервис», г. Могилев, ул. Первомайская, д. 99.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в МГ УКП «Центр по приватизации» следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон;

копию платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на расчетный счет МГ УКП «Центр по приватизации» 3012213290010 в ГФ по Могилевской области ОАО «Белинвестбанк», МФО 153801712, УНН 700008710, последний день внесения задатка «1» апреля 2011 г;

юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь:

копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица;

доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя;

юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь:

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть получена не ранее 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя;

индивидуальным предпринимателям:

копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя;

доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя;

физическим лицам – гражданам Республики Беларусь, физическим лицам – иностранным гражданам: - документ, удостоверяющий личность.

Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником аукциона, предмет торгов по решению аукционной комиссии продается этому лицу при его согласии (далее – лицо, приравненное к победителю аукциона) по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

До подписания договора аренды победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней, не считая дня проведения аукциона, обязан перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет торгов, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также в соответствии со счетом-фактурой возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды заключается арендодателем и победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение 5 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета торгов осуществляется победителем (лицом, приравненным к победителю) аукциона в белорусских рублях в установленном